Беларусь.info

№67 06/06/2006

*Найдакладнейшае вымярэнне каштоўнасці чалавека — не тое, што ён робіць у час спакою і ўтульнасці, а тое, як ён трымаецца падчас барацьбы і супярэчнасцяў.*
**Марцін Лютэр Кінг**

Грамадская пазапалітычная і пазацэнзурная ініцыятыва. Распаўсюджваецца бясплатна

# Падзеі

**Да галадоўкі "маладафронтаўцаў" далучаюцца новыя ўдзельнікі**. Працягваецца галадоўка актывістаў моладзевых арганізацыяў. Галадоўнікі патрабуюць, каб улады спынілі пераслед прадстаўнікоў апазыцыі. Некалькі непаўналетніх сяброў “Маладога фронту” спынілі галадоўку на просьбу кіраўніцтва незарэгістраванай арганізацыі. Але да акцыі пратэсту адразу ж далучыліся новыя ўдзельнікі. Колькасьць галадоўнікаў у Менску і ў рэгіёнах перавышае чатыры дзясяткі чалавек.

**“Грынпіс” прэзэнтуе незалежнае дасьледаваньне вынікаў аварыі на ЧАЭС.** Сёньня ў Менску адбылася прэзэнтацыя справаздачы аб выніках аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Справаздача падрыхтаваная міжнароднай экалягічнай арганізацыяй “Грынпіс”. Гэта альтэрнатыўным погляд на праблему наступстваў аварыі. Нагадаем, перад 20-годзьдзем аварыі свой дакумэнт прадставілі грамадзкасьці Міжнароднае агенцтва атамнай энэргіі (МАГАТЭ) і Ўсясьветная арганізацыя аховы здароўя.

**Затрыманы 5 чэрвеня ў Мінску непаўналетні грамадзянін Украіны Арцём Чысцякоў знаходзіцца ў спецпрыёмніку-размеркавальніку. Найхутчэй ён будзе дэпартаваны.** Нагадаем, учора на Кастрычніцкім пляцы сталіцы мусіў адбыцца флэш-моб у падтрымку рэпрэсаваных і дэпартаваных падчас прэзідэнцкай выбарчай кампаніі ў Беларусі. Але перад пачаткам акцыі міліцыя правяла прэвентыўныя затрыманні. Беларусаў адпусцілі ў той жа дзень. Высветлілася, што Арцём Чысцякоў ужо затрымліваўся ў Мінску ў сакавіку падчас ліквідацыі намётавага мястэчка.

**Беларускія прадпрымальнікі пачалі кампанію ў падтрымку Мікалая Аўтуховіча, які з 23 траўня праводзіць сухую галадоўку ў гродзенскім следчым ізалятары.** Яны збіраюць подпісы пад заявай, якая будзе накіраваная ў рэспубліканскую пракуратуру. Ініцыятары акцыі патрабуюць ад пракуратуры распачаць крымінальную справу ў дачыненні асобаў, што нясуць адказнасць за пераслед Аўтуховіча. Прадпрымальнікі перакананыя, што ён ні ў чым не вінаваты і прыводзяць у сваёй заяве факты. «Зараз галоўная задача — выратаваць жыццё Мікалаю Аўтуховічу, стан якога крытычны», пераказвае словы Аляксандра Макаева, аднаго з лідэраў прадпрымальніцкага руху.

# Людзі

**Вячаслаў Сіўчык зьвярнуўся да беларускай дыяспары.** Апазыцыйны палітык, кіраўнік незарэгістраванага “Руху беларускай салідарнасьці “Разам” Вячаслаў Сіўчык, які знаходзіцца ў Кіеве, зьвярнуўся да беларускай дыяспары. У звароце спадар Сіўчык заклікае суайчыньнікаў, якіх “якіх антыбеларускі рэжым выцесніў за мяжу, але не пазбавіў любові да Бацькаўшчыны”, зьвяртацца “да лідэраў сямі вядучых краінаў свету ў тым, што яны не маюць маральнага права ехаць на саміт G- 8 у Санкт-Пяцярбург, пакуль Пуцін публічна не адмовіцца ад планаў правядзення чарговага ганебнага рэферэндуму”.

# Абвесткі

**Новы конкурс – "Фота Свабоды"**. "Фота Свабоды" – Ваш погляд на беларускае жыццё. Дасылайце (з кароткім апісаннем – што, дзе, калі) здымкі падзеяў, сітуацыяў, людзей на адрас svaboda@rferl.org з пазнакай "fota Svabody". Падрабязнасці на www.svaboda.org